

# ДА 50-ГОДДЗЯ ДЗМІТРЫЯ МІКАЛАЕВІЧА РАДЗІВОНЧЫКА

***Дарагі Дзмітрый Мікалаевіч!***

50 год – значная веха ў жыцці кожнага чалавека, а тым больш творчага. Хочаш ці не, узгадваюцца пройдзеныя шляхі-сцяжыны, падзеі, па якіх і праз якія Вы ішлі да сённяшніх здабыткаў і дасягненняў. А іх у Вашым жыццёвым і творчым заплечніку даволі шмат. Таму што шмат сіл і намаганняў паклалі Вы на тое, каб гродзенская пісьменніцкая арганізацыя працавала цікава, эксклюзіўна, непадобна на іншыя. Гарадзенцы ўдзячны Вам за «Словадром», грамадскую літаратурную школу, шматлікія інтэрнэт-праекты і акцыі. Адкрыццё і падтрымка многіх імёнаў, уводзіны новых асоб у літаратурнае асяроддзе Прынёмання – таксама Ваша заслуга. Ваша слова, сказанае пісьмова і вусна, – заўсёды важкае, адметнае, трапнае. Без Вас мы не ўяўляем існавання нашага творчага Саюза. У дзень юбілею жадаем Вам, дарагі наш калега, сябар і аднадумца, добрага здароўя, кахання і любові, творчага натхнення на новыя праекты на доўгія гады, а таксама міру і згоды ў душы і навакольным свеце! Няхай квітнее літаратура Гродзеншчыны, няхай свяціцца ў ёй Ваша імя! ***З ЗАЛАТЫМ ЮБІЛЕЕМ!***



***Калектыў***
***Гродзенскага абласнога аддзялення***
***Саюза пісьменнікаў Беларусі***

**5 ліпеня 2023 года**